Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка
аддзел бібліятэчнага маркетынгу

**Хроніка**
**культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за кастрычнік 2014**

**<u>Мерапрыемствы да Дня пажылых людзей</u>**

**1 кастрычніка**

Свята “Закружилась в танце осень” праведзена Залескай СБ сумесна з Закросніцкай СБ.

З цёплымі словамі да прысутных звярталіся старшыня Залескага сельвыканкама - В.П. Іванюк, настаяцель Петра-Паўлаўскай царквы - айцец Аляксандр, старшыня Залескага Савета ветэранаў - Л.М.Рымарук, малодшыя школьнікі і інш.

У зале панавала цёплая атмасфера, гучала музыка, песні, ушаноўваліся імяніннікі, у канцы ўсіх частавалі чаем і прысмакамі.

*Залеская СБ, 68 чал.*

**3 кастрычніка**

Літаратурна-музычны вечар “Старшее поколение выбирает общение”. У рамках мерапрыемства арганізавана выступленне ЛПГ "Натхненне", гучалі музычныя нумары ад народнага ансамбля песні "Спатканне". З захапленнем гледачы прынялі ўдзел у віктарынах "Бацькі і дзеці", "Залатыя россыпы мудрасці", а таксама ў конкурсе "Сакрэт маёй бадзёрасці", успомнілі прыказкі пра бабуль і дзядуль. Самыя актыўныя былі ўзнагароджаны памятнымі прызамі.

*Гарадзецкая СБ, 65 чал.*

**5 кастрычніка**

Гадзіна карысных сустрэч “Онлайн – Б@буля” сабрала жанчын сталага ўзросту з мэтай пазнаёміцца з Інтэрнэтам і яго магчымасцямі. Жанчыны жартавалі, успаміналі мінулае, цікавіліся новымі тэхналогіямі сучаснай бібліятэкі. Бібліятэкар пазнаёміла іх з сайтам Кобрынскай ЦБС.

*Батчынская СБ, 15 чал.*

**7 кастрычніка**

Пасяджэнне аматарскага клуба «Золотые годы» - «Закружила осень золотая» адбылося у чытальнай зале Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі .

У чарговы раз пасяджэнне прайшло сумесна з клубам "Сустрэча".

Адкрылася мерапрыемства відэапрэзентацыяй з самых цікавых момантаў пасяджэнняў клуба на працягу некалькіх гадоў. Гучалі музычныя і паэтычныя віншаванні ў адрас пажылых людзей.

Удзельнікі клуба "Сустрэча" прадэманстравалі дэфіле ў стылі рэтра. Розныя займальныя конкурсы, арыгінальныя пажаданні-сюрпрызы, кніжныя выставы разнастаілі праграму вечара.

*Цэнтральная бібліятэка, 80 чал.*

## Мерапрыемствы да Дня маці

**12 кастрычніка**

Пасяджэнне аматарскага клуба “Час і ты” – “От матерей вся гордость мира” прайшло ў палітыхнічным каледжы. Падлеткам падрыхтавалі відэапрэзентацыю і літаратурна-музычную капмазіцыю “Рожденное с любовью слово “Мама”. Адбыўся прагляд кніжнай выставы “Свет материнской любви”. Студэнты пагутарылі з мнагадзетнай маці Блінкоўскай Г. М. Сярод прысутных адзначылі лепшых чытачоў года, якія атрымалі невялікія падарункі.

*Цэнтральная бібліятэка, 25чал.*

**12 кастрычніка**

Выступленне ЛПГ “Цяпло мацярынскага сонейка”. У мерапрыемстве ўдзельнічалі дзеці, якія з любоўю і павагай віншавалі сваіх матуль, спявалі песні, прысвячалі ім вершы. Бібліятэкар з дапамогай дзяцей арганізавала кніжную выставу “Матуліны кнігі”.

*Буховічская СБ, 14 чал.*

**14 кастрычніка**

Свята “З любоўю да Маці”. Для прысутных матуль прагучалі песні і віншаванні. Дзеці падрыхтавалі падарункі сваім мамам і ўдзельнічалі ў конкурсе малюнкаў “Свет мацярынства – свет любві”.

Бібліятэкар адзначыла сярод жанчын самых чытаючых: Ляшчынскую Н. М., Давідовіч Г. В., Ліс А. А. і інш.

*Лукская СБ, 85 чал.*

**19 кастрычніка**

Гадзіна культуры на вытворчым участку “Імя любові – Любоў Мацярынская”. Бібліятэкар сумесна з работнікамі клуба наведалі вытворчы ўчастак і павіншавалі жанчын кветкамі, песнямі і вершамі.

*Шамятоўская СБ, 13 чал.*

## Іншыя мерапрыемствы

**12 кастрычніка**

У мерапрыемстве пад назвай “468 Дзень нараджэння”, прысвечаным вёсцы Павіцце, прыняла ўдзел бібліятэкар сельскай бібліятэкі - адзначыла лепшых чытачоў бібліятэкі, уручыла падарункі і граматы. Усе госці ўдзельнічалі ў конкурсах і віктарынах. Жыхары вёскі парадавалі сваімі талентамі, паказалі сваё майстэрства.

*Павіццеўская СБ, 100 чал.*

**24 кастрычніка**

У цэнтральнай бібліятэцы прайшоў семінар-практыкум «Краязнаўчыя рэсурсы бібліятэкі - традыцыйныя і электронныя». У рамках вучобы кадраў разгледжаны пытанні па перакладзе назапашаных краязнаўчых матэрыялаў у электронную форму.

Галоўныя спецыялісты бібліятэкі і бібліятэкары Лукскай СБ - Пятруковіч Н. І., Астроміцкай СБ - Редзьковіч Е. А., Кіселявецкай СБ - Кірчук Н. І., Імянінскай СБ - Баранская Т. М. і інш. падзяліліся вопытам па стварэнні краязнаўчых электронных баз дадзеных.

Для ўсіх прысутных прадстаўлена відэапрэзентацыя «Кобрыншчына - багатае мінулае, дастойнае сучаснае».

*Центральная бібліятэка, 70 чал.*

Выканаўца:
метадыст АБМ
Кузьмінчук Ю. В.
Тел. 23681